Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА
ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 22 (674) ● ПЯТНІЦА, 16 чэрвеня 1967 г. ● Цана 2 кап. Год выдання XX

Пропускам для паездкі на цаліну былі добрыя поспехі на экзаменах. І студэнтка хімфака Вера Фаміна паспяховай здачай сесіі завявала яго.

Фота А. КАДЗЕТА.

РАШАЮЧЫЯ БАІ

Сёлета разам з савецкімі студэнтамі на розных курсах і розных факультэтах здаюць экзамены каля 250 замежных студэнтаў з розных краін свету і кантынентаў. Зараз на падрыхтоўчым факультэце трымаюць выпускныя экзамены 150 в'етнамскіх і афрыканскіх студэнтаў.

Калі параўнаць вынікі экзаменацыйнай сесіі з першымі паказчыкамі цяперашняй, то можна зрабіць вывад, што многія студэнты крытычна падыйшлі да сваіх поспехаў на зімовых экзаменах. На цяперашнюю сесію яны прыйшлі з добрай падрыхтоўкай.

В'етнамскія студэнты падрыхтоўчага факультэта Ле Тхі Оань, Нгуен Зуй Чыен, Нгуен Суан Хан, афрыканскія студэнты Элака Марсель, Жан Дзіанкуіка, Алік Мвева, Замбо Эсайе і іншыя, якія атрымалі раней па рускай мове адзнаку добра, зараз здалі выпускны экзамен на выдатна. Лепшыя веды па фізіцы прадэманстравалі студэнты Чан Зань Ліем, Фам Зыонг, Нгуен Тха Хоа, Ву Тхань і іншыя. Яны атрымалі на выпускным экзамене па фізіцы выдатна.

Паспяхова вытрымалі першыя экзаменацыйныя баі ветэраны выдатнай вучобы Чан Тхі Там, Нгуен Фыок Лан, Нгуен Ле Куан, Ву Нгок Ан, Фам Кі Ань.

Заглянем на хвілінку ў аўдыторыю, каб паглядзець, што адбываецца на падрыхтоўчым факультэце ў даны момант.

Доўгі калідор, усюды на дзвярах можна прачытаць: «Цішэй — ідуць экзамены». То тут, то там перад дзвярыма топчуцца студэнты, лішні раз заглядваюць у канспекты, кніжкі, успамінаюць тое, што ад хвалявання часам вылятае з памяці.

Вось выходзіць з аўдыторыі Лыонг Хонг Дык. Сябры бягуць насустрач, каб павіншаваць яго моцным поціскам, а ён нават рукі не працягвае. Усе застываюць у неразуменні. Але хутка весялеюць, жартуюць, калі выясняецца, што іх таварыш на выпускным экзамене па фізіцы атрымаў адзнаку добра! Але Лыонг Хонг Дык па-ранейшаму не задаволены. Хлопцу не пашанцавала. Зайшоў па пяцёрку, а выйшаў з чацвёркай... Што ж, здараецца і такое. Зазначым толькі, што крытычныя адносіны студэнтаў да свайго поспеху — гэта плюс яшчэ адзін бал. Такім чынам складаемае знайшлося і будзем лічыць, што сума, як кажуць матэматыкі, амаль не змянілася.

Экзамены ў самым разгары. Для кожнага яны перш за ўсё сур'ёзная справаздача перад радзімай, народам, які чакае, што станеш высококваліфікаваным спецыялістам, сапраўдным будаўніком жыцця. Першыя экзамены паказваюць, што пераважная большасць студэнтаў гэта разумее ў поўнай меры. Асабліва адказная гэтая экзаменацыйная сесія для замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта, бо ад яе вынікаў залежыць, — будзе студэнт накіраваны на вучобу ў вышэйшую навучальную ўстанову або тэхнікум па выбранай спецыяльнасці, ці не.

Рашаючыя баі для нашых замежных сяброў пачаліся, і мы жадаем ім выдатных поспехаў.

Ул. ГАЛАЙША.

Кансультацыю па матэматыцы дае старшы выкладчык падрыхтоўчага факультэта Уладзімір Аляксеевіч Мельнікаў.

Фота Яўгена Данілава.

РЫХТУЙСЯ Ў ДАРОГУ, ЦАЛІННІК!

У гэты гарачы час, калі поўным ходам ідзе сесія, студэнтаў, якія паедуць на цаліну, ні на хвіліну не пакідаюць думкі аб прасторных казахстанскіх стэпах, аб тым, як яны пачнуць узводзіць новыя жылыя дамы, кашары.

У тых, хто ўжо некалькі разоў бываў на цаліне, хто загартаваўся пад пякучым сонцам, набыў некалькі сумежных будаўнічых спецыяльнасцей, узнікаюць пытанні: што можна зрабіць, каб паскорыць тэмпы работы на будоўлях, як палепшыць арганізацыю працы, а таксама забяспечыць ўсім неабходным. Гэты працоўны семестр студэнты нашага універсітэта прысвячаюць 50-годдзю Савецкай улады і таму аб'яўляюць ударным. І ў кожнага цалінніка стала больш адказнасці. Арамя таго, што працаваць прыйдзецца лепш, чым у мінулым годзе, трэба дапамагчы авалодаць справай тым, хто ўпершыню стане цалінікам.

Вось усе гэтыя і многія іншыя пытанні будуць вырашацца на сходзе цалінніка ў атрада «Юнацтва» фізфака, які адбудзецца 21 чэрвеня. А пакуль што ў інтэрнатах ідуць старанныя прыгатаванні да ад'езду — звязваюцца ў стопкі вучэбнікі (сесія ўжо закончана), у рукзакі складваецца рабочая вопратка. І, канешне, многія бяруць з сабой музычныя інструменты — студэнт без песні і музыкі не можа жыць.

Б. МЯДЗЬВЕДЗЕЎ.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫ ВЕЧАР

У маляўнічай мясціне сталіцы нашай рэспублікі Мінска, у «Зялёным тэатры» лесапарку трактарнага завода, адбыўся цікавы інтэрнацыянальны вечар. У зале сабралася шмат моладзі, дый не толькі моладзі, але і старэйшае пакаленне — удзельнікі Вялікай Айчыннай вайны, якія перажылі жахі нашэсця на нашу Радзіму карычневай фашысцкай чумы. На гэты вечар была запрошана вялікая група замежных студэнтаў падрыхтоўчага факультэта нашага універсітэта. У прамовах выступаючых адчувалася жаданне жыць заўсёды ў міры, змагацца супраць падпальшчыкаў вайны, мацаваць дружбу паміж народамі.

Прамова студэнта БДУ Ву Нгок Ан некалькі разоў перапынялася гарачымі апладысментамі. Асабліва бурныя і працяглыя былі яны, калі в'етнамец выказаў словы шчырай удзячнасці і падзякі Камуністычнай партыі Савецкага Саюза і Савецкаму ўраду за бескарыслівую дапамогу ў барацьбе з амерыканскім імперыялізмам.

На вечары выступілі студэнты і з іншых замежных краін, якія вучацца ў нашым універсітэце. Інтэрнацыянальны вечар з'явіўся яркай дэманстрацыяй жадання дружбы народаў розных краін і кантынентаў.

В. СПЕНКАРАЎ.

КАНФЕРЭНЦЫЯ МАТЭМАТЫКАЎ

У галоўным корпусе нашага універсітэта з 27 па 30 чэрвеня будзе праходзіць Другая рэспубліканская канферэнцыя матэматыкаў Беларусі. Яна пачне сваю работу з 10 гадзін у актавай зале.

На пленарным пасяджэнні выступяць Міністр вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР М. В. Дарашэвіч, рэктар універсітэта прафесар А. Н. Сеўчанка. З дакладам «Аб развіцці матэматыкі БССР за 50 год» выступіць прафесар Д. А. Супруненка, а доктар фізіка-матэматычных навук У. П. Платонаў выступіць з дакладам «Ацэнка мінімальнага аб'ёму вылічальнай работы».

На пасяджэнне запрашаюцца студэнты, аспіранты і супрацоўнікі універсітэта.

Д. КЛІМАЎ.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ДРУГАЯ ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ Сесія вядзе падлік *Людзі непрыкметнай прафесіі* **Узбекская паэтэса — наш госць** *Расце сям'я выкладчыкаў*

НАШЫ ІНТЭРВ'Ю

ЯШЧЭ АДЗІН ВУЧОНЫ САВЕТ

Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» за апошні тыдзень атрымала некалькі пісьмаў, думка якіх зводзіцца да аднаго: чытачы просяць расказаць аб філалагічным вучоным савеце, які створаны нядаўна пры філалагічным факультэце і факультэце журналістыкі.

Наш карэспандэнт А. Іваноў узяў інтэрв'ю ў прарэктара па навучальнай рабоце прафесара доктара філасофскіх навук В. І. Сцяпанава:

— Стварэнне новага вучонага савета ва універсітэце абумоўлена некалькімі вельмі важнымі акалічнасцямі. Самая важная з іх — стварыць у нашай вышэйшай навуковай установе ўсе ўмовы для абароны дысертацый па шырокаму колу навук і праблем. Да гэтага часу, скажам, юрысты не мелі магчымасці абараняць кандыдацкія і доктарскія дысертацыі ва універсітэце, што ў нейкай ступені адмоўна адбівалася на росце кандыдатаў і дактароў навук на гэтым факультэце. Дый БДУ за апошнія гады ператварыўся ў буйнейшую навуковую ўстанову рэспублікі і не толькі рэспублікі. Папулярнасць яго з кожным годам расце. Таму многія маладыя даследчыкі жадаюць абараняць кандыдацкія дысертацыі ў нашым універсітэце.

Вучонаму савету гуманітарных навук было цяжка спраўляцца з гэтымі задачамі. Таму ён раздзяліўся на два вучоныя саветы — гуманітарны і філалагічны.

Такім чынам створан ва універсітэце чацвёрты па ліку вучоны савет. Гэты факт з'яўляецца яскравым прыкладам росту навукі ў Беларусі за 50 год існавання Савецкай улады, размаху даследчай работы яе навуковых кадраў. Калі, напрыклад, на філфаку ўсяго некалькі год назад быў толькі адзін доктар навук, то цяпер іх восем. Паявілася і вялікая армія кандыдатаў. Таму Філалагічны вучоны савет складае моцнае навуковае ядро: 44 дактары і кандыдаты навук. Старшынёй яго з'яўляецца доктар філалагічных навук М. Г. Булахаў, намеснік — дэкан факультэта журналістыкі дацэнт Р. В. Булацкі, вучоным сакратаром — О. В. Казлова.

УРАДЖАЙНЫ МЕСЯЦ

СТВАРЭННЕ Філалагічнага вучонага савета — вялікая падзея ў жыцці нашага універсітэта. Гэты дзень назаўсёды застанецца ў памяці вучоных, студэнтаў не толькі БДУ, але і многіх іншых вышэйшых навучальных устаноў Беларусі. Адкрыццё яго ў юбілейным годзе многаму абавязвае яго састаў, з'яўляецца яркім праяўленнем клопату роднай Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада ў справе развіцця навукі і культуры. Менавіта такая гаворка вялася днямі на ўрачыстым пасяджэнні-адкрыцці Філалагічнага вучонага савета. Пад гучныя апладысменты зачытваюцца імёны дактароў, кандыдатаў навук, якія выбраны членамі савета. Тут было названа імя доктара філалагічных навук, прафесара М. Г. Булахава. Таленавіты вучоны выбран старшынёй савета. Яго намеснікам — кандыдат гістарычных навук Р. В. Булацкі, вучоным сакратаром савета з'яўляецца О. В. Казлова.

У выступленнях вучоных — словы адданасці развіццю сацыялістычнай навукі і ідэям Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, падзяка за клопаты аб развіцці навукі бацькаўшчыны.

Пасля ўрачыстай часткі адбылася першая ў гісторыі новага вучонага савета абарона дысертацыі на званне кандыдата філалагічных навук. Гэтага гонару ўдастоен аспірант трэцяга года навучання Вечыслаў Рагойша. Тэма яго работы: «Паэтыка Максіма Танка». Кіраўнік дысертанта, апаненты, а таксама выступіўшыя вучоныя далі высокую ацэнку даследаванням Рагойшы. Прымаецца адзінадушнае рашэнне. Вечыслаў заслугоўвае прысваення яму вучонага звання — кандыдата філалагічных навук. Сябры горача віншуюць «шчасліўчыка», уручаюць кветкі, шчыра абнімаюць Вечыслава.

Ітак, падлік Філалагічнага вучонага савета пачаўся. Пакуль на яго рахунку толькі адна абароненая дысертацыя і першае пасяджэнне. Але галоўнае тое, што з 14 чэрвеня пачаўся весціся яго слаўны летапіс. Напісан першы пратакол пасяджэння. А 24 чэрвеня іх ужо будзе больш. Прадставілі да абароны кандыдацкія дысертацыі аспірант П. І. Ткачоў і рэдактар «Настаўніцкай газеты» М. Е. Дастанка.

Шчаслівай дарогі табе, Філалагічны вучоны савет! Горача віншуем прафесараў, выкладчыкаў, студэнтаў з гэтай знамянальнай падзеяй!

А. РАМАНАЎ.

ТРЫМАЙСЯ, ГЕОЛАГ!

Геолаг... Колькі рамантыкі, колькі бадзёрай акрылёнасці выклікае ў душы гэтае слова!.. Геолаг — гэта перш за ўсё ў нашым увасабленні чалавек, які заўсёды ў паходзе, у пошуках багаццяў зямных нетраў, чалавек, які назаўсёды пасябраваў з прыродай. Але сёння наша гаворка не пойдзе аб адкрыццях геолагаў у тундры і Усходняй Сібіры, аб іх буднях у гарачых пясках пустыні Кара-Кум... Гаворка пойдзе пра другое—вучобу, бо перш чым пайсці «на разведку ў тайгу», трэба набыць шмат неабходных ведаў. Яны менавіта і вырашаць каму «паехаць у гарачы Туркменістан», а каму прыдзецца развітацца з прафесіяй геолага. Так, так, бо ўжо першы год вучобы цвёрда размеркаваў іх на выдатнікаў, троечнікаў і нават... двоечнікаў.

Нікога не здзіўляе ў наш час тое, што з аднаго боку ідзе далейшая дыферэнцыяцыя навук, а з другога — мацнее і мацнее іх ўзаемасувязь. Таму біёлаг, скажам, побач са спецыяльнымі дысцыплінамі вывучае вышэйшую матэматыку, хімію, фізіку. Геолагам ўжо на першым курсе прыйшлося сустрэцца з хіміяй і вышэйшай матэматыкай. Вучоба на працягу семестра праходзіла напружана і старанна. Шмат трэба было і выконваць лабараторных работ. Дый геалагічнае аддзяленне першае ва універсітэце, на яго будуць раўняцца астатнія, яму пачынаць традыцыю геолагаў у БДУ.

У час летняга семестра геолагі здавалі чатыры залікі: замежная мова, палеанталогія, гісторыя КПСС, фізвыхаванне. Здавалася, што тут нічога складанага няма. Але многія геолагі «спатыкнуліся» ужо на першым заліку. З першага, як кажуць «заходу» не здалі замежнай мовы С. М. Мядзьведзь, В. А. Какорын, С. А. Капаевіч, В. А. Зубок, В .В. Гусараў—усяго дзевяць чалавек. Гэта не можа не насцярожыць: замежную мову геолагу трэба ведаць дасканала. Два незалікі па гісторыі КПСС. А В. В. Гусараў і А. А. Жукаў аказаліся адзінымі, хто не здаў заліка па геадэзіі.

З такімі вынікамі дзве групы геолагаў (у агульным саставе 50 чалавек) падыйшлі да экзаменаў. На іх выявіліся выдатнікі. Сярод дваццаці пяці студэнтаў першай групы ім аказаўся толькі адзін—О. С. Барысевіч. На добра і выдатна здалі В. А. Зубок (вышэйшую матэматыку і хімію), С. А. Капаевіч (вышэйшую матэматыку). Чацвёра студэнтаў не пераскочылі вышэй добрай адзнакі, але і не адступілі на лазіцкі троечнікаў. Гэта В. В. Бабічаў, Н. В. Галіотта, Г. М. Герасімаў, З. Б. Ляндрас.

На старонках газеты «Беларускі універсітэт» вялося ў свой час шмат гаворкі аб тым, што троечны спецыяліст не патрэбен вытворчасці, што аддача ад яго малая. Быць троечным спецыялістам-геолагам не ўваходзіць ні ў якія рамкі. У студэнтаў гэтай групы вельмі многа троек па трох здадзеных экзаменах — палеанталогіі, хіміі, вышэйшай матэматыцы. Паявіліся «кругленькія» троечнікі: А. Г. Барэйка, В. І. Крукоўскі, В. І. Агафонаў — вышэй «дзяржаўнай» так і не змаглі пераскочыць.

Цвёрдым арэшкам для геолагаў аказалася вельмі патрэбная для іх ў далейшым дысцыпліна—хімія. 13 здавальняючых, 4 нездавальняючых і толькі дзве выдатныя адзнакі. Тры выдатна, 11 добра, 4 нездавальняюча — такі дэбют здачы экзамена па вышэйшай матэматыцы. Такім чынам па адной двойцы ў першай групе маюць Л. В. Вдавухін, Л. Т. Грабеннікаў, а В. В. Гусараў і А. А. Жукаў па дзве.

Затое ў другой групе геолагаў справы добрыя. Адчуваецца, што калектыў у ёй падабраўся выдатны, для якога вучоба стала цяпер найпершым абавязкам. Многа цёплых слоў аб гэтай групе гавораць і выкладчыкі. Але звернемся да фактаў. На экзамене па палеанталогіі 8 выдатных адзнак і толькі тры здавальняючыя. 7 выдатных адзнак па хіміі. Характэрна, што па гэтых дысцыплінах няма ніводнай нездавальняючай. Сесію, здавалася б, гэта група здасць без «паражэння», але І. П. Шалудзька, А. А. Марозаў, А. М. Мазуркевіч, па вышэйшай матэматыцы атрымалі нездавальняючыя адзнакі.

Летняя сесія ў геолагаў з'явілася вынікам іх работы за год. Для тых, у каго ў залікоўках стаяць нездавальняючыя, яна стала сур'ёзнай перасцярогай таго, што за дзень-два сесійнай падрыхтоўкі да экзамена навуку не адолееш, а трэба напружана рыхтавацца на працягу ўсяго навучальнага года. Толькі навука дапаможа геолагу пракласці цяжкую сцежку да адкрыццяў тайны прыроды.

П. ГЛЕБКА.



Ідзе пошук. *Фота А. КАДЗЕТА.*

РЭПАРТАЖ

АДЗІНАЙ

НА ПРАЦЯГУ ўсяго навучальнага года студэнты аддзялення філасофіі гістарычнага факультэта вучыліся старанна. Рэгулярна наведвалі заняткі. Яшчэ не было ніводнага выпадку, калі хто-небудзь з іх не быў падрыхтаваны да семінарскіх заняткаў. Наогул, аб групе можна гаварыць многа добрага.

Тут налічваецца дваццаць пяць студэнтаў. Усе яны здалі залікі. Толькі дваіх з іх спаткала няўдача — яны пераздавалі.

Калі гаварыць пра першакурснікаў, лепш іх будзе зразумець тады, калі успомнім зімовую сесію, якую на выдатна здалі Аляксандр Байчароў, Міхаіл Віннікаў, Юрый Шынкар, Ольга Ігнаценка — усяго сем чалавек.

І вось мы пераносімся ў цяперашнюю сесію. Экзамен па палітычнай эканоміі. Яшчэ не прыйшоў экзаменатар, а стол быў ужо прыбраны па-святочнаму. На ім — кветкі. Прыпамінаецца добрая традыцыя ў школе. Там экзамен не абыходзіцца без кветак.

Некалькі хвілін... Выкладчык палітычнай эканоміі капіталізма Уладзімір Андрэевіч Кулажанка запрашае студэнтаў у аўдыторыю.

Я падумаў, што, як бывае звычайна, студэнты будуць браць білеты і садзіцца абдумваць пытанні, але быў крыху здзіўлены, калі Аляксандр Байчароў, атрымаўшы білет, накіроўваецца да экзаменатара. Ён вырашыў адказваць адразу, без абдумвання.

Першае пытанне: «Эканамічнае становішча рабаўладальніцкага ладу». Усё адказаў без ніякіх пагрэшнасцей. Дапаўняльныя пытанні таксама. Саша добрасумленна рыхтаваўся да заняткаў на працягу ўсяго вучэбнага года.

Другое пытанне: «Стварэнне сярэдняй нормы прыбытку і пераўтварэнне кошту тавара ў цану вытворчасці» А. Байчароў ведаў як на памяць. У выдатных ведах палітэканоміі капіталізма можна было нічуць не сумнявацца. Уладзімір Андрэевіч з вялікім задавальненнем выводзіць у залікоўцы студэнту выдатна. Адказ Сашы падбадзёрыў настрой выкладчыка.

Пасля яго адказвае Юрый Шынкар. І зноў выдатна. Юрый не толькі ведае матэрыял, але і лагічна абдумвае кожную праблему, прыводзіць прыклады з жыцця, асабліва добрыя веды паказаў ён па пытанню аб расколе свету на дзве супроцьлеглыя сістэмы і барацьбе паміж імі. Як добра эрудыраваны чалавек у гэтых адносінах, ён назваў прычыны, якія сведчаць аб частых крызісах капіталістычнай сістэмы, аб росце беспрацоўнасці. Юрый дасканала расказаў аб тых перавагах, якія мае сусветная сацыялістычная сістэма над капіталістычнай.



Пакуль ідзе экзамен, мы перанясемся ў мінулае аддзялення філасофіі — будні студэнтаў да сесіі. Шчыра кажучы, першакурснікі з'яўляюцца прыкладам для многіх аддзяленняў і курсаў гістарычнага факультэта. Гэта не значыць, што тут сабралася толькі здольная моладзь. Яны ўсе тут аднолькавыя. Старанная вучоба на працягу ўсяго семестра. Гэтую акалічнасць не аднімеш у філосафаў.

Акрамя заняткаў, яны прымаюць актыўны ўдзел у грамадскім жыцці. Мы не раз бачылі на сцэне ў актавай зале універсітэта Юрыя Шынкара. Ён удзельнік ансамбля народных інструментаў універсітэта. А Міхаіл Віннікаў займаецца ў канькабежнай секцыі. Можа, пройдзе пэўны час, і ён, як зараз Уладзімір Новікаў, які займаецца спартыўнай хадзьбой, таксама атрымае сярэбраную медаль на рэспубліканскіх спаборніцтвах.

Камсорг першага курса Надзя Беляковіч — член КПСС. Яна ў асноўным расказвае аб камсамольскім жыцці аддзялення. Група прыкладае шмат намаганняў, каб былі больш змястоўныя будні факультэта, каб студэнты захапляліся не толькі вучэбнікамі і навукай, але і цікавіліся многімі пытаннямі сувязі будучых філосафаў з жыццём факультэта — гэта, як, вы бачыце, не толькі тое, што ў камсамольскім бюро гістфака ёсць два прадстаўнікі з іхняга аддзялення:

РАЎНЕННЕ НА НАВУКУ

Выкарыстанне навуковаабгрунтаваных метадаў у вырашэнні важнейшых праблем, у кіраванні складанымі сацыяльнымі працэсамі—гэта патрабаванне нашага часу. Яно не абмінула і камсамол, які праяўляе жывую цікавасць да навукі кіраўніцтва. Гэты інтарэс мае свае аб'ектыўныя прычыны. А іменна: узрослы культурны і агульнаадукацыйны ўзровень савецкай моладзі, які патрабуе іншага падыходу да яе выхавання. Вось чаму ўжо створаны і працуюць сацыялагічныя групы, грамадскія інстытуты і лабараторыі па вывучэнню маладзёжных праблем пры райкомах, абкомах, ЦК ЛКСМ саюзных рэспублік.

За апошнія гады стала ўсё прыкметней умацаванне сувязей паміж камсамолам і навукай. Яскравым прыкладам гэтага з'яўляецца прайшоўшая нядаўна у Маскве Усесаюзная навукова-тэарэтычная канферэнцыя «Сацыялізм і моладзь», якая прысвечана 50-годдзю Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. Арганізатарамі такога навуковага форума, які праводзіўся ўпершыню ў нашай краіне, былі ЦК ВЛКСМ, Прэзідыум Акадэміі Навук СССР, Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР.

Маладзёжных праблем нямала, і яны не такія простыя, а таму патрабуецца калектыўны савет, калектыўны розум для іх вырашэння. Канферэнцыя на працягу пяці дзён абмяркоўвала сацыяльныя, ідэалагічныя, эканамічныя, этычныя, юрыдычныя і іншыя праблемы моладзі і гісторыі камсамола. У ёй прынялі ўдзел больш чатырохсот вучоных з 118 гарадоў краіны — філосафы, гісторыкі, сацыёлагі, эканамісты, псіхолагі, юрысты, педагогі, і каля 300 камсамольскіх работнікаў. Тут былі і буйныя вучоныя, і тыя, хто ўпершыню ступіў на навуковую сцежку, выдатныя людзі нашай краіны, радавыя камсамольскія работнікі.

У рабоце канферэнцыі ўдзельнічалі віцэ-прэзідэнты Акадэміі Навук СССР М. Д. Мільёншчыкаў, А. М. Румянцаў, дырэктар Інстытута філасофіі Акадэміі Навук СССР акадэмік Ф. В. Канстанцінаў, намеснік дырэктара Інстытута дзяржавы і права Акадэміі Навук СССР, доктар юрыдычных навук А. Е. Лунёў, Прэзідэнт Савецкай сацыялагічнай асацыяцыі Г. В. Осіпаў і іншыя. Актыўны ўдзел прымалі сакратары ЦК ВЛКСМ — С. П. Паўлаў, Ю. В. Тарсуеў, А. І. Камшалаў, А. Ю. Чарнявічус і іншыя, а таксама сапрацоўнікі апарата ЦК ВЛКСМ. На пасяджэннях можна было сустрэць Герояў Сацыялістычнай працы: гэта — старшыня калгаса «Новае жыццё» Малдаўскай ССР Б. В. Глушко, брыгадзір шахты імя Дзімітрава з Данецкай вобласці К. А. Северынаў, галоўны інжынер нафтапрамысловага ўпраўлення імя XXII з'езда КПСС (Азербайджанская ССР), кандыдат філасофскіх навук А. А. Данафараў. На заключным плянарным пасяджэнні канферэнцыі прысутнічаў Герой Савецкага Саюза летчык-касманаўт Ю. А. Гагарын.

Ад нашай рэспублікі на канферэнцыі было дзесяць чалавек, прычым, трое з універсітэта: кандыдат філасофскіх навук, старшы выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі Я. В. Пятушкова, кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі КПСС А. І. Жураў і аўтар гэтага артыкула. Супрацоўнікі нашага універсітэта былі не проста назіральнікамі, а актыўнымі ўдзельнікамі. Так, Я. В. Пятушкова выступіла з дакладам «Выкарыстанне навуковых метадаў у рабоце камсамольскіх арганізацый» на секцыі «Удасканаленні арганізацыйнай работы камсамольскіх арганізацый і павышэнне яе выніковасці», А. І. Жураў — на секцыі па гісторыі ВЛКСМ з дакладам «Аб рабоце маладых камуністаў у камсамоле». Акрамя двух плянарных пасяджэнняў, на канферэнцыі тры дні працавала 12 секцый, дзе было абмеркавана прыблізна 350 дакладаў. Гэта сведчыць аб вельмі інтэнсіўнай рабоце канферэнцыі, аб вялікай увазе вучоных да маладзёжнай праблематыкі. І ўсё ж, як адзначалася, гэтая ўвага некалькі аднабаковая. З больш як 300 абароненых дысертацый, якія закраналі камсамольскія

ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ

НАРЫС

Калі вам хоць раз прыходзілася бываць у чытальнай зале для аспірантаў нашага універсітэта, вы, напэўна, добра запамяталі чалавека, які выдаваў вам кнігі —Анну Аронаўну Эвенчык. Не запамятаць вы не маглі: вы гаварылі з чалавекам, у якога б'ецца шчырае, добрае сэрца, на вас глядзелі цёплыя ласкавыя вочы, поўныя жыццёвага вопыту і мудрасці. А той, каму прыходзіцца больш часта бываць у бібліятэцы і гаварыць з Аннай Аронаўнай, ведае, што не вельмі ўжо часта даводзіцца сустракаць чалавека з такім вялікім сэрцам, якое ўсё, усё поўнасцю, без астачы, аддана людзям. Жанчына, якой ужо, як у нас звычайна гавораць, пара на пенсію, на адпачынак, за плячыма якой ужо 66 гадоў, аб гэтым адпачынку і не думае. Адпачынак... Не, я таксама не магу ўявіць Анну Аронаўну без калектыву, у якім яна паўсядзённа знаходзіцца, без працы, якой яна аддала ўсё жыццё.

— Цяпер? — здіўляецца Анна Аронаўна. — Без працы? Што вы? Наадварот, калі мне часамі выпадае адпачынак, я не магу знайсці сабе месца, я адчуваю: чагосьці не хапае.

Працоўны шлях Анны Аронаўны пачаўся адразу ж пасля Кастырчніцкай рэвалюцыі, якая дала магчымасць ёй, як і ўсёй моладзі, не толькі працаваць, але і вучыцца. 1921 год. Адкрываецца Беларускі дзяржаўны універсітэт. Анна Аронаўна ў ліку першых студэнтак факультэта грамадскіх навук. Заводы, фабрыкі, школы чакаюць маладых спецыялістаў: урачоў, інжынераў, настаўнікаў, якіх так не хапала маладой сацыялістычнай краіне.

Анна Аронаўна добра памятае тыя школы, дзе ёй у якасці філолага прышлося працаваць аж да 1941 года, пакуль не пачалася вайна. Гэта мінскія школы нумар 10, 45, 26. Яе вучні —сёння пажылыя, «салідныя» вучоныя, інжынеры, настаўнікі. Яны надоўга запамятаюць вобраз сваёй добрай, любімай настаўніцы, яе ўрокі, гутаркі...

І вось вайна. Чорнай фашысцкай навалай змятаецца ўсё, усё, што было створана чалавечымі рукамі, што прыносіла карысць і радасць. Сеецца смерць, гора, слёзы. Вайна ўрывалася ў кожны дом, у кожную сям'ю. Эвакуіруецца Беларускі дзяржаўны універсітэт, дзе працаваў выкладчыкам муж Анны Аронаўны — Саламон Васільевіч Хануцін. Дарога ляжыць на Чэлябінск. У Чэлябінску Анна Аронаўна настаўнічае ў школе. Саламон Васільевіч выкладае ў тэхнікуме. Тут закончваюць дзесяцігодку сыны-блізняты Хануціных— Міша і Алік. Але вайна прымусіла разлучыцца з сынамі. Міша і Алік ідуць на фронт, туды, дзе змагаліся і паміралі ўсе, каму была дарагой свабода, хто быў сапраўдным грамадзянінам сваёй Айчыны.

Алік пасля заканчэння артылерыйскай школы — на фронце, Міша пасля заканчэння ваеннага вучылішча— таксама на фронце. Рэдкія, сумныя і радасныя для бацькоў пісьмы ў Чэлябінск. Сыны пісалі аб падзеях на фронце.

І вось пісьмо... Нечаканае... Яны ўсе прыходзілі нечакана, як нечаканымі былі і кулі ворага... 1943 год. 31 чэрвеня. Гора і слёзы ўрываюцца ў хату Хануціных... У час прарыву блакады Ленінграда загінуў Алік...

Чорная, бязлітасная вайна!.. 1945 год. Фашыстаў гналі ў сваё логава. Набліжаўся час перамогі...

І вось зноў пісьмо камандавання... «Смерцю мужных... За свабоду і незалежнасць нашай Радзімы...» Міша... За Львовам...

Не здзіўляйцеся, калі часамі вам давядзецца бачыць на вачах Анны Аронаўны слёзы. Гэта слёзы маці аб загінуўшых сынах, чыстыя, жаночыя слёзы, слёзы гора, якое не сціраецца з гадамі.

Усё пасляваеннае жыццё Анны Аронаўны звязана з універсітэтам. Тут да канца свайго жыцця працаваў Саламон Васільевіч, сціплы і сумленны чалавек.

Адразу, пасля вайны, было цяжка. Універсітэт узнаўляў сваю работу на станцыі Сходня, пад Масквой, і толькі пасля вызвалення Мінска вярнуўся на сваё ранейшае месца, на плошчу імя Леніна. Але ж хіба было гэтае месца ранейшым? Мінск быў разбураны і спапялелы. Ад былых карпусоў універсітэта больш-менш уцалеў толькі фізіка-матэматычны. Работы было многа. У гэтыя цяжкія часы працы і ўзнаўлення сталіцы і універсітэта асабліва вызначлася Анна Аронаўна Эвенчык —супрацоўнік бібліятэкі.

Амаль усё жыццё Анны Аронаўны звязана з моладдзю. Доўгі час яна працуе агітатарам, выступае перад студэнтамі, рабочымі на прадпрыемствах і ўстановах Мінска.

Нядаўна Анну Аронаўну перавялі працаваць з чытальнай залы для студэнтаў у чытальную залу для аспірантаў і супрацоўнікаў.

— Ну, цяпер Вам, відаць, Анна Аронаўна, — пытаюся я, — працаваць лепш, спакайней? Аспіранты — усё ж народ больш дысцыплінаваны...

— Вы ведаеце, — адказвае яна, — работы хапае ўсюды і заўсёды. Часта робім выстаўкі новай літаратуры. Прыходзіцца многа чытаць. Новых кніг да нас паступае шмат, і, каб быць у курсе ўсіх навінак, прыходзіцца чытаць нават пасля работы, — і потым дадае, — і ўсё ж больш за ўсё я люблю студэнтаў. Я вельмі і вельмі люблю студэнтаў.

А студэнты?... Анна Аронаўна паказвае шматлікія віншавальныя тэлеграмы, паштоўкі, пісьмы...

— Ад сяброў, ад былых выпускнікоў, — гаворыць яна.

Вось адно з пісем. З дазволу Анны Аронаўны я разгортваю і чытаю: «Дарагая, Анна Аронаўна! Напярэдадні гэтага знамянальнага свята — Міжнароднага жаночага дня — хочацца перадаць Вам тое шчырае, цёплае пачуццё, якое захоўваем мы, былыя студэнты, да Вас. Мала мы Вам пішам, але ўспамінаем часта. І ўспамінаем мы Вас, Анна Аронаўна, з добрай сяброўскай, мацярынскай усмешкай... І тое цяпло, якім Вы сагравалі нас, не магло застацца незаўважаным, а наадварот, аставіла глыбокія, дарагія для ўспамінаў сляды. Ведайце і памятайце, дарагая Анна Аронаўна, што Вы былі і застанецеся добрым, чулым, патрабавальным сябрам студэнтаў. Будзьце заўсёды маладымі! Іменна такія людзі патрэбны людзям!

З павагай Дана».

Гэта піша выпускніца хімічнага факультэта 1960 года Данута Уласевіч. А колькі яшчэ такіх шчырых і цёплых лістоў атрымлівае Анна Аронаўна!

І гэта лісты залатой восені ў жыцці чалавека, гэта багаты дар таму, хто ўсё сваё жыццё сеяў людзям дабро і свет.

А. САКАЛОВІЧ.

СЯМ'ЁЙ

Уладзімір Залінін і Анатоль Зелянкоў.

Нядаўна студэнты самі вырашылі зрабіць турысцкі паход у вёску Прылукі. Тут і актыўны адпачынак, і знаёмства з цікавымі мясцінамі роднай Беларусі...

Ужо адказалі чатыры студэнты, з якіх трое атрымалі выдатныя адзнакі.

Міхаілу Віннікаву не прадстаўляла цяжкасці адказаць на пытанні. У час вучобы ён прачытаў шмат дапаможнай літаратуры — артыкулаў на эканамічныя тэмы у часопісах і газетах. Чаму б не радавацца Міхаілу? Экзамен па палітэканоміі здаў на выдатна. Яго навуковая работа «Развіццё У. І. Леніным марксісцкай тэорыі ўзнаўлення» атрымала дыплом першай катэгорыі.

Уладзімір Андрэевіч назваў Тадэуша Адула адным з лепшых студэнтаў аддзялення філасофіі. Гэты старанны юнак працай і добрасумленнем прабіваў сабе дарогу ў жыццё. Перад паступленнем ва універсітэт многа год працаваў рабочым. У душы ў яго засталася назаўсёды адна добрая рыса характару — працалюбства. Ён і тады, калі яшчэ быў токарам, са змены ў змену перавыконваў нормы выпрацоўкі.

Вось вынікі экзамена: выдатна — дзесяць студэнтаў, добра — адзінаццаць, здавальняюча — дзве, няздавальняюча — дзве.

Наперадзе ў філосафаў яшчэ ёсць экзамены. Студэнты і іх здадуць не горш, чым палітэканомію. І так кожны экзамен. Ну, хіба будзе чатыры-пяць здавальняючых адзнак. І то гэта лічыцца для філосафаў многа.

А. ЦЕРАХОВІЧ.

На здымках: ідзе экзамен па палітэканоміі. Выкладчык, кандыдат эканамічных навук У. А. Кулажанка апытвае першакурснікаў — філосафаў.

На выдатна здалі экзамен Уладзімір Кузьмінаў і Уладзімір Новікаў.

Пакуль глыбокі роздум. А праз хвіліну — другую Оля Ігнаценка будзе трымаць справаздачу перад экзаменатарам...

Фота А. КАДЗЕТА.

У БУДУЧЫХ ЮРЫСТАЎ

У пачатку другога семестра на першым курсе юрыдычнага факультэта быў створан студэнцкі навуковы гурток дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва. Нягледзячы на тое, што гурток створан не так даўно студэнты прымаюць у яго рабоце актыўны ўдзел.

Раз у месяц студэнты-гурткоўцы збіраюцца для абмеркавання дакладаў. Кіраўнік гуртка дацэнт А. А. Галаўко. Ён заўсёды прыходзіць на дапамогу ў выбары неабходнай літаратуры па даследаванню, рэгулярна праводзіць кансультацыі. Таму работы студэнтаў атрымліваюцца цікавымі. Не так даўно адбылося чарговае пасяджэнне гуртка, на якім заслухалі даклад студэнта першага курса Г. Навіцкага на тэму: «Суверанітэт БССР у складзе СССР». Паведамленні дакладчыка выклікалі вялікую цікавасць у прысутных. Разгарэлася дыскусія. Актыўны ўдзел у абмеркаванні прынялі студэнты Міхасёў, Рабаў, Літоўчанка, Жданава, Кажадуб і іншыя.

Я думаю, што такія пасяджэнні садзейнічаюць больш глыбокаму вывучэнню канкрэтных навук і лепшай арганізацыі навуковай работы студэнтаў.

К. БЛЕЦКО,
стараста навуковага гуртка.

НАТАТКІ З КАНФЕРЭНЦЫІ «САЦЫЯЛІЗМ І МОЛАДЗЬ»

ска-маладзёжныя праблемы, звыш 200 прысвечана гісторыі. Каб выправіць становішча, канферэнцыя вылучыла шэраг вельмі актуальных і перспектыўных тэм, якія, несумненна, прыцягнуць увагу даследчыкаў, асабліва маладых.

Цяпер коратка аб змястоўным баку гэтага навуковага форума. Перадаць усё багацце зместу проста немагчыма, але ў самых агульных рысах можна сказаць, што тут быў абагулены багацейшы вопыт па камуністычнаму выхаванню моладзі, па яе ўдзелу ў будаўніцтве сацыялізма і камунізма. У гэтых адносінах прыцягваў увагу даклад сакратара ЦК камсамола Ю. В. Тарсуева «Сацыялізм і моладзь», зроблены ім на першым пленарным пасяджэнні.

Абагульняючы вопыт, удзельнікі канферэнцыі ў той жа час асноўную ўвагу сканцэнтравалі на важнейшых і яшчэ не вырашаных праблемах жыцця, на вучобе і дзейнасці моладзі. Абмеркаванне гэтых праблем насіла адкрыты, палемічны характар, што сведчыла аб глыбокай зацікаўленасці ў іх правільным вырашэнні. Нельга было не заўважыць, што вучоныя сталі бачыць глыбей, асэнсоўваць складанасці і цяжкасці нашага развіцця, выхавання моладзі. Вельмі добра сказаў у сваім дакладзе на заключным, пленарным пасяджэнні акадэмік А. М. Румянцаў: «Перш, чым вучыць моладзь — трэба яе дасканала вывучыць. Гэты прынцып, які заўсёды выконваўся ў мінулым, павінен стаць у сацыялістычным грамадстве краевугольным каменем навуковага падыходу да выхавання моладзі». Ён падкрэсліў неабходнасць выяўлення сацыяльнага партрэту сучаснага маладога пакалення.

Не ўдаваючыся ў тэкст, хочацца асобна зазначыць, што даклад А. М. Румянцава выклікаў вялікае ўражанне на ўдзельнікаў канферэнцыі глыбінёй аналіза шэрагу навуковых праблем, энцыклапедычнасцю зместу, сваёй страснасцю і партыйным клопатам аб будучым развіцці як прыродазнаўчых, так і грамадскіх навук. Паяўленне на трыбуне А. М. Румянцава было сустрэта бурнымі апладысментамі, для гэтага былі ўсе прычыны: па першае, дзень назад ён быў выбраны віцэ-прэзідэнтам АН СССР; па другое, А. М. Румянцаў упершыню выступіў пасля хваробы. Змястоўны і востры характар даклада не раз выклікаў апладысменты ў зале.

Моладзь трэба вывучаць— менавіта аб гэтым сведчыла ўся работа канферэнцыі усіх 12 секцый, дзе перш за ўсё вылучыліся канкрэтныя сацыялагічныя даследаванні маладзёжных праблем. І тут асабліва адзначыліся ленінградскія і свярдлоўскія вучоныя, дэлегацыя якіх была самай моцнай: на канферэнцыі каля 40 чалавек, якія прывезлі з сабою некалькі дзесяткаў экземпляраў двух цікавых зборнікаў: «Жыццёвыя планы моладзі» і «Моладзь праца, вучоба, адпачынак». Гэтыя кнігі, якія ўмяшчаюць шырокія сацыялагічныя даследаванні, карысталіся вялікай папулярнасцю.

На секцыйных пасяджэннях былі спробы разгледзець эфектыўнасць розных ідэалагічных сродкаў у фарміраванні камуністычнага светапогляду ў розных катэгорыях моладзі — рабочай, сельскай, студэнцкай і школьнай. Абмяркоўвалася цікавая і важная ідэя аб прыняцці спецыяльнага Закона аб моладзі. Прававое палажэнне падросткаў павінна быць юрыдычна замацавана — гэта адна з мэт і задач закона. Падкрэслівалася, што камсамол павінен ўдзельнічаць у кантрольнай дзейнасці, а гэтае права камсамола юрыдычна не зацвержана.

Жыццю і дзейнасці студэнцкай моладзі была прысвечана работа спецыяльнай секцыі. І тут абмяркоўваліся вельмі цікавыя і злабадзённыя пытанні, такія, як «Праблемы фарміравання навуковага светапогляду студэнцтва ў працэсе вывучэння грамадскіх навук», «Аб ролі камсамольскай арганізацыі вышэйшых навучальных устаноў у развіцці навуковай і тэхнічнай творчасці студэнтаў», «Вывучэння ўнутрыкалектыўных сувязей ў студэнцкіх групах», «Вывучэнне бюджэта часу студэнтаў», «Аб некаторых баках духоўнага жыцця студэнтаў» і шмат іншых.

Проста немагчыма пералічыць усе тыя праблемы, якія абмяркоўваліся на канферэнцыі. Яе праца была напружанай, але і ў той жа час цікавай, змястоўнай. Пачуццё шчырасці і добрапажадання, творчасці пранізвало работу канферэнцыі ад пачатку да канца. Заслугоўвае пахвалы і абслугоўванне ўдзельнікаў навуковага форума.

На заключным пленарным пасяджэнні, якое праходзіла ў актавай зале гасцініцы «Юность», былі падведзены вынікі дзейнасці секцый і канферэнцыі ў цэлым. Як адзначыў у сваім заключным слове першы сакратар ЦК ВЛКСМ С. П. Паўлаў, усе сценаграмы канферэнцыі будуць дэталёва вывучацца, будзе абмеркавана кожная думка, кожная практычная прапанова і рэкамендацыя. Было адзінадушным прызнанне таго, што такія канферэнцыі трэба праводзіць рэгулярна, каб сканцэнтраваць увагу на важных праблемах.

Канферэнцыя, можна сказаць, з'явілася своеасаблівым аглядам навукі аб моладзі, і ў той жа час тут камсамол даў спецыяльны заказ навуцы — актыўней вывучаць складаныя працэсы жыцця моладзі і распрацоўваць канкрэтныя, навукова-абгрунтаваныя рэкамендацыі для ўпраўлення гэтымі працэсамі, каб поўнасцю выкараніць суб'ектывізм і памылкі. Канферэнцыя выявіла слабасць навукі ў гэтым накіраванні і вызначыла новыя рубяжы. Падкрэслівалася, што маладзёжная тэматыка і праблематыка павінны заняць трывалае месца ў навукова-даследчай рабоце выкладчыкаў вну, аспірантаў, маладых вучоных.

І апошняе. Хацелася б параіць членам камітэта камсамола універсітэта і факультэтаў пазнаёміцца з некаторымі матэрыяламі канферэнцыі (тэзісы канферэнцыі апублікаваны) і пры магчымасці выкарыстаць у сваёй рабоце каштоўныя прапановы.

Камсамол і навука... У гэтым саюзе ёсць нешта сімвалічнае, характэрызуючае якасныя зрухі, якія адбыліся ў развіцці нашага грамадства за апошнія гады. Гэты мацнейшы саюз будзе вельмі плённым як для камсамола, так і для навукі. Раўненне камсамола на навуку — дэвіз часу!

Ю. ГУСЕЎ,
кандыдат філасофскіх навук, удзельнік Усесаюзнай навукова-тэарэтычнай канферэнцыі «Сацыялізм і моладзь».

...заслугоўвае прысваення яму

А. РАМАНАЎ.

НЕЗАБЫЎНЫЯ СУСТРЭЧЫ

НАШЫ СЭРЦЫ Б'ЮЦЦА РАЗАМ

ПРАЙШЛО ўсяго некалькі дзён з таго часу, калі мы з вялікім задавальненнем мелі магчымасць сустракацца з удзельнікамі Дэкады узбекскай літаратуры і мастацтва ў Беларусі — артыстамі тэатраў, кіно, лепшымі спевакамі, паэтамі, кампазітарамі.

Дэкада закончана, нашы госці вярнуліся дамоў, у сонечны Узбекістан, але надоўга застануцца ў памяці беларускіх гарадоў і сёл цудоўныя канцэрты, сустрэчы, гутаркі.

Для студэнтаў-філолагаў нашага універсітэта, відаць, найбольш памятнай застанецца сустрэча з народнай паэтэсай Узбекістана Зульфіёй, якая завітала ў наш гуманітарны корпус якраз перад самым ад'ездам на радзіму. Нягледзячы на тое, што сустрэча абдывалася ў самы разгар экзаменацыйнай сесіі, у час, калі студэнт, здаецца, сядзіць над падручнікам (і думае, як здаць), у актавай зале было мнагалюдна. Разам з Зульфіёй прыйшлі ва універсітэт паэты Узбекістана Шукурло, Эркім Вахідаў, артыстка Юсупава, нашы беларускія паэты Эдзі Агняцвет, Еўдакія Лось, Сяргей Грахоўскі і многія іншыя прадстаўнікі узбекскай і беларускай культуры.

АБ ЖЫЦЦІ і творчым шляху Зульфіі расказала Эдзі Агняцвет, якой вельмі часта прыходзілася сустракацца з народнай паэтэсай яшчэ ў гады Вялікай Айчыннай вайны, калі братнія рэспублікі нашай краіны былі ахоплены адным горам, адным змаганнем супраць ненавіснага ворага.

Ад імя студэнтаў нашага універсітэта народную паэтэсу Зульфію горача віталі студэнты аддзялення беларускай мовы і літаратуры Міхась Губернатараў і Ліда Брыгадзіна. Яны расказалі аб той асаблівай увазе, з якой ставіцца беларуская моладзь да літаратуры і мастацтва Узбекістана.

— Знаёмячыся з вашай цудоўнай паэзіяй, — гаварыла Ліда Брыгадзіна, звяртаючыся да Зульфіі, — мы адчуваем усю узбекскую паэзію, яшчэ больш пазнаем яе непаўторнае харaство, як і харaство ўсяго узбекскага народа.

МІХАСЬ ГУБЕРНАТАРАЎ, як адзін з маладых паэтаў, падарыў гасцям кніжкі «Узлёт» — зборнік студэнтаў-літаратараў нашага універсітэта.

Беларуская паэтэса Еўдакія Лось прачытала свае пераклады вершаў Зульфіі са зборніка «Вернасць», які выпусціла сёлета выдавецтва «Беларусь».

Сяргей Грахоўскі, таксама адзін з перакладчыкаў паэзіі Зульфіі, зазначыў:

— У нас, у многанацыянальнай савецкай паэзіі, ёсць шмат народных паэтэс, у Таджыкістане, Эстоніі, Латвіі і іншых рэспубліках, але мне не прыходзілася перакладаць іх вершаў. Думаў: паэтэс, няхай перакладаюць паэтэсы, куды ўжо там мне... Калі ж ўдалося пазнаёміцца з паэзіяй Зульфіі, якая закранае не толькі жаночай сціпласцю, але і агульным усхваляваннем, я не ўтрымаўся і ўпершыню адважыўся перакласці яе творы.

Сяргей Грахоўскі зачытвае верш «Кропля» ў сваім цудоўным перакладзе.

ПАД ГУЧНЫЯ воплескі бярэ слова Зульфія. Яна перадае гарачае прывітанне ад узбекскага народа.

— Калі чалавек збіраецца ў дарогу, — гаворыць яна, — ён бярэ з сабой самае неабходнае. Адпраўляючыся ў вашу рэспубліку, мы ўзялі з сабой любоў, пачуцці і прывітанні узбекскага народа, якія адрасаваны беларускаму народу. Дзе б мы ні бывалі, ваш гераічны народ сустракаў нас як самых дарагіх гасцей, з хлебам і соллю... Мы адчувалі вялікае задавальненне, вялікую радасць гасціць у такой дзівоснай краіне, як Беларусь. Нам было вельмі прыемна адчуваць тую братэрскую любоў і павагу, якой сагравaў нас беларускі народ на працягу ўсіх сустрэч. Вялікае дзякуй. Мы вернемся дадому і перададзім свайму краю цеплыню вашай душы і сэрца.

Далей Зульфія гаворыць аб вялікім прызначэнні паэзіі ў сённяшняй стваральнай працы ўсяго савецкага народа, аб ганаровым і адказным прызначэнні паэта. Яна зазначае, што беларуская літаратура карыстаецца ва Узбекістане асаблівай павагай. Праз вашу літаратуру, — гаворыць Зульфія, — мы яшчэ больш пазнаем ваш цудоўны гераічны край, яго гісторыю, гісторыю ўсяго беларускага народа. Я вельмі ганаруся, — працягвае паэтэса, — што ў нашым доме, ва Узбекістане, у цяжкія гады Вялікай Айчыннай вайны жыў Якуб Колас: ён быў вельмі вялікім паэтам. Цяпер адна з вуліц Ташкента носіць яго імя. Прамову яна заканчвае сваімі вершамі, якія прачытала на ўзбекскай і рускай мове.

У ЗАКЛЮЧЭННЕ сустрэчы беларускі пісьменнік дацэнт Іван Якаўлевіч Навуменка ад імя ўсіх прысутных горача падзякаваў узбекскіх гасцей за тое, што яны завіталі ў наш універсітэт да студэнтаў, за цёплыя і шчырыя пачуцці, якія былі выказаны ў адрас усяго беларускага народа.

Узбекскім сябрам прыпадносяцца кветкі. А пасля, — так заўсёды бывае на філалагічным факультэце на асабліва выдатных і памятных сустрэчах, — аўтографы, пажаданні, шчыры поціскі рук.

А. СВОРАБ.



МІКОЛА ВЯРШЫНІН — СТУДЭНТ ТРЭЦЯГА КУРСА ВЯЧЭРНЯГА АДДЗЯЛЕННЯ ГІСТАРЫЧНАГА ФАКУЛЬТЭТА. ЯГО ВЕРШЫ, БАЙКІ, ГУМАРЭСКІ МОЖНА ПРАЧЫТАЦЬ У ЧАСОПІСАХ, МНОГІХ ГАЗЕТАХ. СЁННЯ МЫ ЗМЯШЧАЕМ ЯГО ТВОРЫ.

Студэнцкі гумар

ПРА ПЛЯМЫ

— Адказ вы скончылі?
Дык вось:
У ім адны белыя плямы,
Якія цягнуцца бясконца.
— Але ж вы ведаеце самі,
Што і на сонцы плямы ёсць,
А я ж, вядома, вам не сонца!

ВЕТЛІВАСЦЬ ПА-СТУДЭНЦКУ

—Цябе падводзіць памяць мо, ці што?
Прафесар наш каля цябе прайшоў.
Ты з ім не паздаровaўся, чаму?
—Дык я ж ўжо экзамен здаў яму!

АДКАЗ ВЫПУСКНІКА

— Як ты думаеш жыць, самастойна?
Твой жыццёвы шлях будзе які?
—На конт гэтага я ўжо спакойны:
Пражыву... Пакуль побач бацькі!

ЯК ЗАГІНУЎ ТАЛЕНТ

Шмат ад яго чакалі ўсе заўжды,
Бо здольнасці меў не абы якія.
Было ў ім зерне таленту тады,
Ды... зерне патанула у мякіне.

ЧУЛЛІВЫ

З кійком заходзіць у трамвай старая.
Сядзіць дзяцюк і збоку пазірае:
— Чаго стаіце? Я параду дам:
Прайдзіце ўперад, месца ўступяць вам.

НЕ ДАРМАЕД

— Не завіце мяне дармаедам,
Будзе ганьба для ўсіх сваякоў,
Бо жыву я, каб кожны з вас ведаў,
На працоўныя сродкі... бацькоў.

СТРАТА ГОЛАСУ

Страшэнна любіць ён футбол:
Хварэе так за кожны гол,
Што жонка потым проста ў горы:
Сіпіць ён з тыдзень, не гаворыць.

НЕ ДАСЫПАЕ

— Так шмат работы — я б кінуць рада:
Не дасыпаю, аж проста мука.
Пайшлі у краму — глядзяць, і праўда:
Не дасыпае... муку і цукар.

З ПЕСНЯЙ ВУЧЫМСЯ І ЖЫВЁМ

Вы не знойдзеце на зямлі такога чалавека, які б не любіў песні. Вельмі ўдала сказана, што «песня будаваць і жыць дапамагае». А студэнты універсітэта скажуць: «І вучыцца таксама».

Песня — гэта і натхненне да працы, да вучобы, гэта і актыўны адпачынак. Чаму б не паслухаць? Мы гаворым пра тую значную частку студэнцтва, якая любіць песні і з разумнай карысцю ўжывае іх. І не дзіўна, што ў нашым універсітэце так многа ўдзельнікаў мастацкай самадзейнасці. Толькі падумайце, адна харавая капэла, якая носіць высокае званне народнай, налічвае ў сваім складзе каля 200 чалавек! А народны аркестр народных інструментаў, а танцавальны калектыў... Ды яшчэ факультэцкія самадзейныя калектывы!..

Нядаўна партком, камітэт камсамола і праўленне клуба універсітэта правялі сход удзельнікаў самадзейнага мастацтва, на якім вырашаліся найбольш актуальныя пытанні. Гаварылася аб важнасці і адказнасці задачы, пастаўленай перад самадзейнымі калектывамі універсітэта — паездкай у горад Тарту, дзе народная харавая капэла, народны аркестр народных інструментаў і танцавальны калектыў прымуць удзел у Трэцім Усесаюзным студэнцкім свяце песні. Але свята песні — гэта заключны этап. 23 чэрвеня адбудзецца Рэспубліканскі фестываль, 3 ліпеня — заключны канцэрт рэспубліканскага зводнага хору.

Самадзейныя артысты павязуць з сабою цікавую багатую праграму, у складзе якой рускія, беларускія і эстонскія песні. Вельмі спадабалася ўдзельнікам капэлы эстонская народная песня «Сінічку вецер ўбаюкаў». Выконвае яе наша салістка Аня Пяскова.

Трэба ўявіць сабе, колькі намаганняў прыкладаюць у гэты час вясенняй сесіі артысты, каб без значных зрываў хадзіць на рэпетыцыі, Рэпетыцыі ж праводзяцца па галасах. Зводны ўсесаюзны хор у час Свята песні будзе налічваць звыш чатырох тысяч спевакоў. Таму вельмі многа адказнасцей у калектыва народнай капэлы. Кіруе ёю заслужаны артыст рэспублікі А. І. Білібін. У арганізацыі па правядзенню рэпетыцый яму дапамагае староста капэлы Ф. Ліўшыц.

Студэнты нашага універсітэта трымаюць цесныя сувязі са студэнтамі братніх прыбалтыйскіх рэспублік. Гэтыя сувязі пашыраюцца яшчэ больш пасля будучай паездкі ў Тарту. Яны будуць гасцяваць не толькі ў студэнтаў, але і на розных прадпрыемствах, установах Літвы, Латвіі, Эстоніі. Пабываюць яны і ў воінаў Савецкай Арміі. Намечаны паездкі ў Даўгаўпілс, дзе нашы артысты выступяць з канцэртам, а таксама ў Эльву. 10 ліпеня яны, як пасланцы беларускага камсамола, пабываюць у гасцях у ваенных маракоў. Дарэчы, камсамол нашай рэспублікі з'яўляецца шэфам Балтыйскага ваенна-марскога флоту.

Народны аркестр народных інструментаў, які са сваёй праграмай едзе таксама ў Тарту, налічвае 65 чалавек. Кіраўнік — М. А. Лісіцын. З імі едуць салісты аркестра Анатоль Злобіч, Анатоль Калеснічэнка, Эла Бабіцкая. Акрамя сумеснага выступлення аркестра, па праграме асобна выступяць салісты Аляксандр Лабковіч і Юрый Шынкар.

Некалькі слоў і аб нашых танцорах, выхавацелем якіх з'яўляецца Л. А. Алексютовіч. Праграма выступленняў — самая разнастайная. Акрамя беларускіх народных танцаў «Лявоніха» і «Кола» яны выканаюць эстонскі «Тульян» і шмат іншых. Усе тры калектывы вышлі на Рэспубліканскі фестываль упершыню. Гэта вялікая перамога нашых самадзейных мастакоў. Безумоўна, павінны быць і поспехі. А гэта значыць: нашы студэнты будуць ехаць у Тарту з добрым настроем. А настрой — гэта спадарожнік удачы.

І праўда ўсе ж, у нашым універсітэце любяць песні, любяць музыку. Студэнты жыццярадасны народ.

А. ЮРЭВІЧ.



На сцэне самадзейныя танцоры універсітэта. Фота А. Кадзета.



Мінскія масты... Фотаэцюд А. Кадзета.

НАША ГАЛОЎНАЯ ПЛОШЧА

...Архітэктурны план плошчы У. І. Леніна зроблен яшчэ ў 1936 годзе. А канчатковы варыянт прапанован архітэктарамі Баткоўскім, Гельфантам і Мартынавым у 1958 годзе.

«Урадавая плошча» — так назваў сваё дзецішча — праект рэканструкцыі плошчы імя Леніна — С. Б. Баткоўскі. Тут будуць сканцэнтраваны ўсе міністэрствы, выканкомы, ведамствы Мінска і рэспублікі. Новыя карпусы універсітэта і педінстытута дапоўняць ансамбль.

Ужо большая частка з задуманага зроблена. І ўсё-такі архітэктары бачаць гэту плошчу іншай, па-новаму закончанай. Знесены з сярэдзіны плошчы будынак адкрые від на Дом Урада. Перад педінстытутам вырасце шаснаццаціпавярховы корпус са шкла і жалезабетона. Па задуме, гэта будзе незвычайнае вучэбнае памяшканне.

З 25-га паверху Дома Міністраў, які размесціцца супроць гасцініцы «Мінск», будзе відаць увесь горад. Усе кабінеты, рабочыя пакоі, прыёмныя будуць выглядаць па-беларуску проста і прыгожа. Гэта цэнтр рэспублікі, яе штаб.

Польскі касцёл, астаўлены спецыяльна як куток старыны, зробіць больш прыгожым ансамбль, упіша ў яго старонку з гісторыі горада.

— Да вайны, — задумёна вымаўляе Сяргей Барысавіч, — мы маглі толькі марыць аб тым, што ўжо сёння стала рэальным. І паветраныя пабудовы са шкла і поліматэрыялаў, і зялёныя газоны з вечна жывымі кветкамі, і мрамарная абліцоўка фасадаў.

— А між іншым, дзеля таго мы і архітэктары, — з усмешкай гаворыць ён, — каб бачыць не за два і тры, а за дваццаць — трыццаць год уперад.

...Гэта была наша першая сустрэча з дойлідам.

Г. СЫРАЕЖКА.

Рэдактар М. І. ІОСЬКА.

АТ 18133 Адрас рэд: Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, П. 106. тэлефон Б-2-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда». Зак. 960.